## ПАРТНОВА ЗІНАІДА МАРТЫНАЎНА



**Месца нараджэння:** Расія, г. Ленінград

**Дата нараджэння:** 20.02.1926

**Дата смерці:** 13.01.1944

**Месца подзвігу:** Віцебская вобл., Шумілінскі р-н, г. п. Обаль

**Дата подзвігу:** 1941–1944

**Ушанаванне:** Віцебская вобл., Шумілінскі р-н,
г. п. Обаль – вуліца, школа, мемарыльная дошка, абеліск;
Віцебская вобл., г. п. Шуміліна – вуліца;
Віцебская вобл., г. Полацк – вуліца;
Расія, г. Санкт-Пецярбург – вуліца; Расія – цеплаход;
г. Мінск – бюст

Удзельнік камсамольскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1941 годзе ў час летніх канікул прыехала ў в. Зуі (злілася з г. п. Обаль) Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці, дзе яе застала вайна. У час нямецка-фашысцкай акупацыі – член камсамольскага камітэта обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы», удзельніца баявой аперацыі, у выніку якой было знішчана каля 100 гітлераўцаў. Пасля правалу падпольнай арганізацыі стала разведчыцай партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава брыгады імя У. І. Леніна. У снежні 1943 года была накіравана ў в. Масцішча Шумілінскага раёна для высвятлення прычыны правалу падпольнай арганізацыі. Калі З. М. Партнова выканала заданне і вярталася ў атрад, трапіла на засаду і была схоплена гітлераўцамі. На допыце застрэліла нямецкага афіцэра. Юную патрыётку завезлі ў в. Баравуха Полацкага раёна і ў студзені 1944 года закатавалі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 01.07.1958 г.

У 1969 годзе на доме, дзе ў 1941–1943 гг. жыла З. М. Партнова, устаноўлена мемарыяльная дошка. Імем патрыёткі названы вуліцы ў г. Санкт-Пецярбургу, г. Полацку, г. п. Шуміліна і г. п. Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. Яе імя прысвоена школе ў г. п. Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Вечная** Зіна. – Режим доступа: http://zviazda.by/be/news/20160422/1461333699-vechnaya-zina. – Дата доступа: 12.03.2021.

2. **Зина Портнова** // Юные герои Витебщины / Н. И. Дорофеенко [и др.]. – Минск, 1980. – С. 80–81.

3. **Кірэйшын, М. В.** Дом, дзе жыла Партнова / М. В. Кірэйшын // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 470.

4. **Кузьміч, Т.** Героі не паміраюць … / Т. Кузьміч // Віцебскі рабочы. – 2013. – 11 чэрв. – С. 6.

5. **Кузьміч, Т.** Дзяўчынка з коскамі, якая заслужыла бессмяротнасць / Т. Кузьміч // Віцебскі рабочы. – 2012. – 21 лют. – С. 3.

6. **Кузьмич, Т.** Ей не было и 18-ти ... / Т. Кузьмич // Віцебскі рабочы. – 2006. – 21 лют. – С. 4.

7. **Липовец, И.** Как пионеры становились героями / И. Липовец // Советская Белоруссия. – 2012. – 7 июля. – С. 5.

8. **Лукина, Л.** Подвиг Зины Портновой / Л. Лукина // Народнае слова. – 2010. – 2 ліп. – С. 2.

9. **Лукина, Л. В.** Урок отваги и мужества / Л. В. Лукина // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрв. 2009 г. / рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.] ; Віцеб. дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава [і інш.]. – Віцебск, 2009. – С. 168–172.

10. **Мезенка, Г. М.** Партновай Зінаіды вуліца / Г. М. Мезенка // Віцебшчына ў назвах вуліц : манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск, 2008. – Ч. 2. – С. 132.

11. **Мельникова, Г. М.** К смерти и бессмертию готова ... / Г. М. Мельникова ; записала Т. Кузьмич // Віцебскі рабочы. – 2002. – 9 крас.– С. 2.

12. **Набатов, Г.** Подвиг Зины Портновой / Г. Набатов // Юность огнем опаленная : повесть / Г. Набатов. – Минск, 1963. – С. 165–178.

13. **Портнова** Зинаида Мартыновна // Герои Советского Союза : краткий биогр. словарь : в 2 т. / редкол.: И. Н. Шкадов [и др.]. – М., 1988. – Т. 2. – С. 311.

14. **Портнова** Зинаида Мартыновна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 494.

15. **Смирнов, В. И.** Зина Портнова : повесть / В. И. Смирнов. – М : Воениздат, 1980. – 223 с. – (Библиотека юного патриота).

16. **Солодов, А.** Девочка с косичками / А. Солодов // Подвигу жить! : сб. / сост. Е. Волк, М. Филиппова. – М., 1981. – С. 107–115.

17. **Солодов, А. С.** Девочка с косичками : повесть о З. Портновой / А. С. Солодов. – М. : Мол. гвардия, 1984. – 128 с. – (Юные герои).

18. **Старавойтов, Н.** Зина Портнова / Н. Старавойтов // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2001. – 20 лют. – С. 1.

19. **Хазанский, В.** Поединок / В. Хазанский // Нам не забыть вас, ребята!: комсомольско-молодежное подполье в годы Великой Отечественной войны : очерки, докум. рассказы, воспоминания / сост. и авт. предисл. Г. Миронов. – М., 1970. – С. 339–340.

**Зина** Портнова // Юные герои Витебщины / Н. И. Дорофеенко [и др.]. – Минск, 1980. – С. 80–81.

## ЗИНА ПОРТНОВА

В июне 1941 года ленинградская школьница Зина Портнова вместе с младшей сестрой Галей приехала на летние каникулы к своей бабушке в деревню Зуи Шумилинского района.

Началась война, и Зина осталась на захваченной гитлеровцами территории. Она не могла спокойно смотреть на зверства оккупантов и при первой же возможности установила связь с обольской подпольной комсомольской организацией «Юные мстители».

По заданию организации Зина устроилась подсобной рабочей в столовой для немецких офицеров. Вскоре вместе с комсомолкой Ниной Давыдовой Зина осуществила дерзкую операцию: отравила более ста гитлеровцев.

Но после этой операции фашисты стали следить за Зиной. Во избежание провала юную подпольщицу переправили в партизанский отряд имени К. Е. Ворошилова бригады имени В. И. Ленина. Она стала разведчицей.

Осенью 1943 года Зину приняли в комсомол, а в декабре ей поручили ответственное задание: разведать численность и род войск врага в районе Оболи, уточнить причины провала в Обольском комсомольском подполье и установить новые связи.

Когда, выполнив задание, она возвращалась в отряд, около деревни Мостище ее схватили каратели. Юную партизанку долго мучили, но ни пытки, ни истязания, ни самые изуверские допросы не принесли результатов. Зина молчала. Во время одного из допросов гитлеровец на секунду отвернулся. В одно мгновение Зина схватила со стола пистолет и в упор выстрелила в своего мучителя. Гитлеровец упал.

Спасаясь от преследования, Зина убила еще двух фашистов, но убежать ей не удалось.

13 января 1944 года фашистские изверги расстреляли юную патриотку.

Указом Президиума Верховного Совета СССР от 1 июля 1958 года Зинаиде Мартыновне Портновой посмертно присвоено звание Героя Советского Союза.

Ленинградская школа № 358, в которой училась отважная пионерка, и один из кораблей советского флота носят имя Зины Портновой.

Зина Портнова занесена в книгу Почета пионерской организации Белоруссии.

**Кузьміч, Т.** Героі не паміраюць ... / Т. Кузьміч // Віцебскі рабочы. – 2013. – 11 чэрв. – С. 6.

## ГЕРОІ НЕ ПАМІРАЮЦЬ...

Амаль сем дзесяцігоддзяў мінула з часоў Вялікай Айчыннай вайны – жудаснай, крывавай, развязанай нямецка-фашысцкімі агрэсарамі супраць мірных савецкіх людзей. Жыццё пад прыгнётам, ва ўмовах жорсткага акупацыйнага рэжыму на роднай зямлі стала немагчымым для тых, хто любіў Радзіму і быў гатовы аддаць жыццё за яе свабоду. Сярод іх і юная піянерка Зіна Партнова, якая прыехала на канікулы разам з малодшай сястрычкай з Ленінграда да бабулі ў вёску Зуі Шумілінскага раёна перад самым пачаткам вайны. І як толькі даведалася, што недзе побач дзейнічаюць патрыёты, адразу ж пачала іх шукаць. А пра тое, што ідзе барацьба з акупантамі, нагадвалі дыверсіі на варожых аб’ектах. Шмат шкоды наносілі фашыстам партызаны і члены патрыятычнага падполля.

Моладзь з вёсак Ушалы, Масцішча, Зуі, Ферма і чыгуначнай станцыі Обаль аб’ядналася ў падпольную арганізацыю «Юныя мсціўцы», якой кіравала камсамолка Ефрасіння Зянькова. Усе яе члены былі залічаны ў партызанскі атрад імя Варашылава брыгады імя Леніна, адкуль і атрымлівалі заданні. Зіна стала актыўнай удзельніцай барацьбы з ворагам. У больш спрактыкаваных падпольшчыкаў яна навучылася канспірацыі, трапна страляць, кідаць гранаты. Дзяўчынка распаўсюджвала лістоўкі, была сувязной, разведчыцай, дыверсанткай. Фашысты збіліся з ног, спрабуючы выявіць патрыётаў, якія не давалі ім спакойна таптаць савецкую зямлю.

Асноўныя дыверсіі здзяйсняліся на станцыі Обаль, праз якую штодзённа праходзіла на фронт каля дзесяці эшалонаў з тэхнікай і жывой сілай ворага. Пасля таго, як патрыёты пры дапамозе міны, замаскіраванай пад кавалак звычайнага вугалю, дашчэнту разбурылі вадакачку, на станцыі гэтыя эшалоны застылі аж на два тыдні, не маючы магчымасці рухацца без вады. А вёдрамі ж яе не наносішся, хоць немцы спрабавалі выправіць сітуацыю і такім чынам. Потым згарэлі два масты на шашы Віцебск – Полацк, арганізаваны дыверсіі на электрастанцыі, льняным і цагельным заводах, у камендатуры, узарвана машына буйнога чыноўніка з зондэрфюрэрам СС і трыма афіцэрамі. На мінах падрываліся машыны і матацыклы, з гарнізона прападалі гітлераўцы. Дзякуючы разведвальным даным, сабраным падпольшчыкамі, больш дакладнымі сталі ўдары з паветра і на зямлі па варожых аб’ектах.

У канцы лета 1943 года дні і ночы ішлі аблавы, вобыскі, арышты. Калі была схоплена частка юных падпольшчыкаў, фашысты адмаўляліся верыць, што столькі шкоды нанеслі ім звычайныя школьнікі. Яны былі ўпэўнены, што выбухі на чыгунцы, на шашы, лістоўкі, падпалы – справа рук дарослых партызан.

605 дзён змагалася падпольная арганізацыя «Юныя мсціўцы». На яе рахунку 22 буйныя дыверсіі. І Зіна Партнова мае адносіны да кожнай з іх. А адну, асабліва небяспечную, дзяўчынка выканала асабіста. У дзённіку камісара партызанскага атрада Маркіянава ёсць запіс пра яе подзвіг. Зіне было даручана ў кацёл з ежай для фашыстаў падсыпаць атруту. Тады піянерка працавала на кухні, абірала бульбу, калі-нікалі мыла посуд. Выбраўшы момант, прыўзнялася на дыбачкі і ўсыпала парашок з пакеціка ў варыва на пліце. Пасля абеду гітлераўцы атруціліся, і выхад са сталоўкі быў блакіраваны гестапаўцамі, якія правяралі ўсіх, каб выявіць вінаватага ў дыверсіі.

Паставілі талерку супу і перад Зінай, загадалі есці. Выбару не было: калі адмовіцца, адразу здагадаюцца, а калі з’есці – памрэ ад атруты. Дзяўчынка адкусіла кавалак хлеба, праглынула лыжку атручанага ёю супу. Ёй паверылі і адпусцілі дадому. Падпольшчыкі пераправілі хворую Зіну да партызан, у шпіталі яе выхадзілі. А больш за 100 эсэсаўцаў знайшлі прытулак на могілках.

16 снежня 1943 года Зіна пайшла на апошняе заданне. Яна павінна была з умоўнага дупла дуба забраць звесткі ад абходчыка пра эшалоны, што ідуць праз станцыю Обаль. Але дупло было пустым, і Зіна пайшла ў вёску. Ей трэба было даведацца, хто выдаў фашыстам яе таварышаў. 12 чалавек з арганізацыі былі схоплены і расстраляны. Грачухін (прозвішча здрадніка) убачыў яе праз акно і сказаў гітлераўцу, якога пасялілі ў яго хаце, што вось ідзе партызанка. Зіну схапілі. Кожную раніцу яе выводзілі на допыты. Каталі, але як ні стараліся, ніякіх звестак ад Зіны атрымаць не ўдалося. Тады за справу ўзяўся вядомы сваёй жорсткасцю начальнік гестапа Краўзе. Ён прымяняў розныя спосабы, каб зламаць дзяўчынку. Не змог. Дапамагла Зіне яго неабачлівасць. Ён паклаў на стол пісталет, а сам падышоў да акна. Зіна скарысталася ім імгнення: забіла свайго ката з яго ж зброі. Пазбавіла жыцця дзяжурнага афіцэра, які зазірнуў у кабінет, а потым, выбіўшы акно, пабегла да рэчкі, каб схавацца ў прыбярэжных кустах. Але ўслед ужо імчаліся гітлераўцы. Яна паспела стрэліць яшчэ ў аднаго фашыста, але была схоплена. Яе зноў білі, здзекаваліся, дзяўчынцы выкалалі вочы, адрэзалі вушы, раздрабілі пальцы. Але не здолелі пахіснуць яе дух. Месяц і чатыры дні юную разведчыцу трымалі ў засценках гестапа. А марознай студзеньскай раніцай 1944 года, калі ўжо быў чутны гул цяжкіх гармат наступаючых савецкіх войск, 17-гадовую сляпую і сівую дзяўчынку з распухлымі пачарнелымі нагамі вывелі на расстрэл. Грымнуў залп. Зіна Партнова зрабіла крок у вечнасць. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Зінаіда Мартынаўна Партнова ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза.

А здрадніка Грачухіна пасля вайны адшукалі недзе на Урале, прывезлі ў Обаль, дзе судзілі адкрытым судом. І, кажуць, каб не міліцыя, яго разарвалі б.

У канцы мінулага года ў Санкт-Пецярбургу выйшлі дзве кнігі, прысвечаныя адважнай піянерцы, Герою Савецкага Саюза Зіне Партновай і юным обальскім падпольшчыкам. Яе аўтар – Ніна Васільеўна Яфрэмава – журналіст, член Расійскага Міжрэгіянальнага саюза пісьменікаў, член-карэспандэнт Акадэміі рускай славеснасці і выяўленчых мастацтваў імя Г. А. Дзяржавіна. Абодва выданні атрымалі ў падарунак ад аўтара Обальскі музей камсамольскай славы і абласная арганізацыя рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб’яднання «Веды».

Не кожны здольны здзейсніць подзвіг. Толькі той, хто ўмее любіць родную зямлю, свой народ, могуць быць адважнымі і адданымі.

***Т. Кузьміч***

**Портнова** Зинаида Мартыновна // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 494.

**ПОРТНОВА ЗИНАИДА МАРТЫНОВНА (20.2.1926 – январь 1944)**

Участница Обольского комсомольского подполья и партизанского движения на территории Витебской области в годы Великой Отечественной войны, Герой Советского Союза (1.7.1958). Родилась в Ленинграде. Член ВЛКСМ. Окончила 7 классов Ленинградской 385-й школы. В июне 1941 приехала на каникулы к родственникам в Белоруссию. Оказавшись на оккупированной территории, в 1942 вступила в подпольную комсомольскую организацию «Юные мстители» в г. п. Оболь, член ее комсомольского комитета. Распространяла листовки, участвовала в диверсиях на кирпичном заводе, электростанции и водокачке на железнодорожной ст. Оболь, а также в операции, в результате которой было уничтожено 100 гитлеровцев. Позднее – разведчица партизанского отряда им. К. Е. Ворошилова бригады им. В. И. Ленина. Проникала в гарнизоны оккупантов и добывала ценные сведения. В декабре 1943 послана с заданием в д. Мостище. Возвращаясь в отряд, попала в засаду и была схвачена гитлеровцами. На допросе застрелила немецкого офицера. Замучена гитлеровцами.

Имя З. М. Портновой присвоено школе в г. п. Оболь, многим пионерским дружинам, ее именем названы улицы в г. Полоцк, городских поселках Оболь и Шумилино; в г. п. Оболь на доме, где она жила, установлена мемориальная доска.